

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№16 (171) 28 мая 1991 года




**Крэнь Іван Платонавіч, нарадзіўся ў 1936 годзе, беларус, член КПСС, адукацыя вышэйшая, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі БССР Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы — кандыдат у народныя дэпутаты Беларускай ССР па Гродзенскай-Горкаўскай выбарчай акрузе № 238.**

## 2 чэрвеня — выбары ў Вярхоўны Савет БССР!

Нарадзіўся 25 лістапада 1936 года ў вёсцы Кузевічы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці Выхадзец з сялян. У 1948, 1951 і 1954 гадах скончыў адпаведна Кузевіцкую пачатковую, Ялуцэвіцкую сямігадовую і Гараднішчанскую сярэднюю школу. З 1954 па 1959 год вучыўся на гісторыка-філалагічным факультэце Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Я.Купалы.

Пасля заканчэння інстытута быў накіраваны ў Радунскі раён, які ў 1962 годзе аб´яднаўся з Воранаўскім раёнам, дзе да 1967 года працаваў на пасадзе дырэктара Праўжскай васьмігадовай (1959 — 1963 гг.), Палецкішскай сярэдняй (1963 — 1964 гг.) і Воранаўскай школы-інтэрната (1964 — 1967 гг.). Адначасова з 1962 па 1966 год вучыўся ў завочнай аспірантуры пры Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У.І.Леніна.

У 1967 годзе прайшоў па конкурсу на пасаду старшага выкладчыка кафедры гісторыі СССР і БССР Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Я.Купалы, пераўтворанага ў 1978 годзе ў дзяржаўны універсітэт. На гістарычным факультэце працуе і ў цяперашні час на пасадзе загадчыка кафедры гісторыі БССР.

У 1972 — 1976 гадах выбіраўся сакратаром парткама Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Я.Купалы, з чэрвеня 1988 па ліпень 1990 года з´яўляецца рэктарам універсітэта марксізма-ленінізма Гродзенскага абкама КПБ. Знаходзячыся на партыйнай рабоце, не траціў сувязей з універсітэтам, вёў па сумяшчальніцтву вучэбную і навуковую работу на кафедры.

У 1981 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1983 годзе прысвоена вучонае званне дацэнта. Аўтар 80 прац, у тым ліку пяці манаграфій, энцыклапедычнага даведніка, двух вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў і выкладчыкаў гістарычных факультэтаў вузаў рэспублікі. У цяперашні час узначальвае аўтарскі калектыў па падрыхтоўцы гісторыка-дакументальнай хронікі горада Гродна «Памяць», з´яўляецца навуковым кансультантам выдаваемай Беларускай гістарычнай энцыклапедыі.

Вядзе значную грамадска-асветніцкую работу, уваходзіць у склад Гродзенскага гаркама партыі, гарадскога і абласнога праўленняў таварыства «Веды», абласнога і рэспубліканскага савета таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, узначальвае рэдакцыйную калегію газеты «Гродзенскі універсітэт».

Міністэрствам народнай адукацыі Беларускай ССР узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік народнай адукацыі», а праўленнем Усесаюзнага таварыства «Веды» — знакам «За актыўную работу».

Жанаты. Двое дзяцей.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

*17 мая адбылося пасяджэнне Савета універсітэта. Разглядаліся тры пытанні: 1) аб увядзенні ў дзеянне новых прынцыпаў аплаты працы; 2) аб правядзенні атэстацыі; 3) зацвярджэнне статуса ліцэя.*

*Адкрыў пасяджэнне рэктар універсітэта Аляксандр Васільевіч Бадакоў. Ён пазнаёміў прысутных з пастановай Дзяржкамітэта па працы № 70, пастановай Савета Міністраў БССР № 153, загадам міністра народнай адукацыі БССР і загадам, які выйшаў у нашым універсітэце. Згодна з гэтымі дакументамі павялічваецца заработная плата супрацоўнікаў універсітэта як дзяржаўная гарантыя мінімальнага ўзроўню аплаты працы. Аляксандр Васільевіч пазнаёміў з мінімальнымі акладамі, якія павінны засцерагчы работнікаў нашай вышэйшай установы ва ўмовах павелічэння цэн. Было заяўлена, што дыферэнцыраваная аплата працы будзе адбывацца з улікам прафесійных якасцей. Перавага надаецца асобам, якія даказваюць сваё высокае педагагічнае майстэрства, навуковую і фундаментальную глыбіню ведаў, тым, хто працуе над напісаннем падручнікаў і засваеннем новых курсаў і метадычных рэкамендацый. Таксама павышэнне заработнай платы плануецца тым выкладчыкам, якія выкладаюць свае курсы на беларускай мове. Рэктар універсітэта адзначыў, што адкрываюцца вялікія магчымасці для творчай навуковай і выкладчыцкай дзейнасці ў сувязі з тым, што міністэрства народнай адукацыі зняло абмежаванні аплаты працы і колькасці вучэбных гадзін. Але галоўным крытэрыем у такіх умовах застаецца якасць працы.*

*Затым Аляксандр Васільевіч звярнуўся да навуковых праблем універсітэта. Мы жывем і працуем у такім рэгіёне, які знаходзіцца на шляхах эканамічнага, навукова-тэхнічнага і культурнага супрацоўніцтва. Таму універсітэту трэба мець канкрэтную праграму дзеянняў, тым больш, што адукацыя ўсё больш і больш пераходзіць на камерцыйныя рэйкі. З 1991 года ва універсітэце сур´ёзная гасбюджэтная тэматыка, якая разлічана на 386 тысяч рублёў. Каля 30 тысяч рублёў пойдзе на выданне манаграфій нашых выкладчыкаў. Ва універсітэта ёсць пэўныя цяжкасці з гаспадарча-разліковай дзейнасцю. Прадпрыемствы сёння не вельмі зацікаўлены ў навуковых вынаходніцтвах, таму неабходна стварыць ва універсітэце аддзел інфармацыі і маркецінгу, які б забяспечваў навуковую работу заказамі, улічваючы патрабаванні кіруючых структур і насельніцтва. На кафедры псіхалогіі плануецца засвоіць курс псіхалагічных асноў кіравання. Не засталіся на Савеце без увагі праблемы факультэта правазнаўства. На гэтым факультэце плануецца ўвесці новую спецыялізацыю, якая б дазваляла выпускнікам факультэта выкладаць юрыдычныя дысцыпліны ў навучальных установах.*

*— У бліжэйшы час, — сказаў Аляксандр Васільевіч, — будзе ўзлёт развіцця сферы паслуг, размеркавання, пасрэдніцтва. У сувязі з гэтым мы маем магчымасць арганізаваць пры універсітэце праз некалькі год эканамічна-юрыдычны каледж. Добра было б стварыць і школу бізнесу. І гэтая заява таксама не беспадстаўная, бо выкладчыкі Уэльскага палітэхнічнага і Йенскага універсітэтаў згодны чытаць у нашым універсітэце лекцыі.*

*Па пытанню аб правядзенні атэстацыі было вырашана правесці яе да 26 мая. Да гэтага тэрміну на ўсіх кафедрах павінны быць падрыхтаваны матэрыялы аб яе выніках. Галоўнымі крытэрыямі былі названы вучэбная, навуковая дзейнасць, дзелавыя і асабістыя якасці і суадноснасць кваліфікацыйнай катэгорыі.*

*Па трэцяму пытанню прысутных праінфарміраваў Юрый Мкртычавіч Вувунікян. Ён расказаў аб асноўных пунктах Статуса ліцэя, пазнаёміў са структурнымі падраздзяленнямі навучальнай установы, са штатным раскладам. На Савеце былі ўнесены некаторыя заўвагі. Было вырашана запісаць, што дырэктар ліцэя назначаецца з ліку вядучых навуковых супрацоўнікаў універсітэта, якія праявілі здольнасці ў рабоце з моладдзю. Дырэктар надзяляецца самастойнасцю ў размеркаванні сродкаў. Намеснікам дырэктара па навуковай рабоце павінен быць таксама супрацоўнік нашага універсітэта. У бліжэйшы тэрмін вырашана сфарміраваць кіраўніцтва ліцэя і Савет ліцэя.*

## УВАГА, КОНКУРС!

**Фонд сацыяльнай абароны студэнтаў і маладых спецыялістаў, створаны пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы, абвяшчае конкурс на распрацоўку эмблемы Фонда. Узоры эмблемы могуць быць выкананыя ў каляровым ці чорна-белым выкананні на 11, 12 ці 22 фармаце паперы па выбару ўдзельнікаў. Эмблема павінна перадаваць мэты і задачы Фонда.**

**Пераможцы конкурсу ўстаноўлена грашовая ўзнагарода ў памеры 50 рублёў.**

**Заяўкі на ўдзел у конкурсе падаюцца да 1 ліпеня 1991 года ў Праўленне ФСАСІМС (ауд. 325 ці 229 вучэбнага корпуса № 1), тэл. 44-82-59, 44-50-54.**

**Праўленне ФСАСІМС.**

## ДЗЯКУЙ!

У гэтым навучальным годзе, пачынаючы з кастрычніка, мы навучаліся на факультэце давузаўскай падрыхтоўкі па рускай мове і літаратуры. Заняткі на гэтым аддзяленні былі цікавымі і змястоўнымі. Мы паспяхова здалі выпускныя экзамены. Карыстаючыся гэтай магчымасцю, хочам праз газету «Гродзенскі універсітэт» сардэчна падзякаваць нашым выкладчыкам: Міка[illegible]ю Пятровічу Чарнякевічу, Святлане Міхайлаўне Антонавай, Святлане Сяргееўне Сыч, Віталію Казіміравічу Церлюкевічу, Алене Васільеўне Сакаловай за ўсё тое добрае, што яны далі нам, і пажадаць поспехаў у іх нялёгкай рабоце, добрых вучняў, моцнага здароўя.

З павагай Н. Караткевіч, І. Вараб´ёва, Т. Бутрым, вучаніцы СШ № 7 г. Гродна.

## АНОНС

Партыя перажывае складаны этап сваёй гісторыі. Крызіс, які паразіў наша грамадства, ускладніў палітычную сітуацыю, пагоршыў становішча народа, не мог не аказаць негатыўнага ўплыву і на партыю. Узмацняецца крытыка справа і злева. Апазіцыйныя сілы імкнуцца разваліць яе знутры, падарваць аўтарытэт сярод шырокіх народных мас, абвінаваціць ва ўсіх смяротных грахах. Чаго толькі не прыпісваюць камуністам, у чым толькі не абвінавачваюць! І ў рэпрэсіях 30-х гадоў, і ў заганах калектывізацыі і індустрыялізацыі, і ў валюнтарызме, і ў застоі... Патрабуюць прад´явіць рахунак за Чарнобыльскую аварыю. Камуністы, аказваецца, вінаваты і ў тым, што бацькі не хочуць, каб адкрываліся беларускія ці польскія школы. І у тым, што пустыя паліцы магазінаў...

Можа хопіць ужо нагнятаць атмасферу напружанасці ў грамадстве, агульна, без разбору абвінавачваць усіх запар людзей, прыналежных да Камуністычнай партыі? Можа хопіць ствараць у грамадскай свядомасці з вобраза камуніста вобраз пачвары і прывіда, якім толькі дзяцей палохаць? Трэба і камуністам урэшце-рэшт заявіць аб сабе, паказаць на справе, а не служыць хлапчукамі для біцця і моўчкі пераносіць увесь той бруд і лаянку, што нясецца з усіх бакоў. Бяру на сябе смеласць сказаць, што сярод камуністаў большасць сумленных, працавітых, таленавітых людзей, на якіх балюча адбіваецца складаная сітуацыя ў грамадстве і якія імкнуцца рабіць справу на сваім месцы добрасумленна, хочуць знайсці выйсце з гэтага становішча.

Партыйная арганізацыя універсітэта не зламалася пад цяжарам праблем і захоўвае ў цэлым згуртаванасць сваіх радоў. І гэта робіць гонар камуністам, якія аказаліся стойкімі ў сучасным супрацьстаянні, захоўваюць вернасць сацыялістычнаму выбару. Партыйная арганізацыя не самаўхіляецца ад бурлівага жыцця, ад вырашэння надзённых праблем. Адракацца ад іх мы не маем права. Шукаць новыя падыходы да вядзення партыйнай работы, сваю ролю ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, грамадска-палітычным жыцці — надзённая наша задача. Вядома, у новых палітычных абставінах змяняецца не толькі роля партыйнай арганізацыі, але і формы і метады яе дзеяння. Нельга жыць старымі ўяўленнямі, вымяраць сённяшняе жыццё меркамі дзесяцігадовых даўнасцей. Нельга таксама адмаўляць і станоўчага вопыту партыйнай работы. Таму парткам сумесна з газетай «Гродзенскі універсітэт» адкрываюць новую рубрыку «Партыйнае жыццё: грані абнаўлення». У ёй мяркуем весці гутарку аб дзейнасці партыйных арганізацый, іх праблемах і пошуках, расказваць аб камуністах, весці дыялог з тымі, хто не падзяляе нашай пазіцыі.

**Матэрыял рубрыкі чытайце на 2 стар.**

## АДГУКНІЦЕСЯ, ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ!

**Чарнобыльская бяда настойліва стукае ў нашыя дзверы. Страшна чуць у свой адрас словы: чарнобыльскі дыягназ. Яшчэ страшней, калі гэта тычыцца дзяцей, для якіх жыццё толькі-толькі пачынаецца.**

**Сёння размова ідзе пра вучаніцу 10 класа сярэдняй школы № 11 Наталлю Горбач. Будучыню гэтай шаснаццацігадовай дзяўчынкі яшчэ можна ўратаваць.**

**Слова яе маме, настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Галіне Уладзіміраўне Горбач.**

**— Апошняя надзея — на добрых людзей. Зараз Наташа праходзіць курс праменнай і радыёдтэрапіі ў Мінскім цэнтры паталогіі і пухлін шчытападобнай залозы. Але тэрмінова патрабуецца лячэнне за мяжой. Для гэтага патрэбна валюта. Я прашу тых, хто мае магчымасць хоць якнебудзь дапамагчы, не пакінуць нас адзін на адзін з нашым горам. Грошы можна пералічыць у аперацыйнае ўпраўленне Беларускага рэспубліканскага банка Знешэканомбанка СССР у г. Мінску МФО 8051536, рахунак № 07025809 «В».**

**Грошы ў рублях, а іх таксама можна будзе памяняць на валюту, можна пералічыць на рахунак № 29299 у ашчаднай касе № 6416/07 у г. Гродна. Дапамажыце, людзі добрыя! Радзі Бога, дапамажыце...**

**Спадзяёмся, што гэтая просьба аб дапамозе не пакіне нас абыякавымі. Жыццё дзяўчынкі яшчэ можна ўратаваць. Пакуль яшчэ можна...**

# ВАШЫ КЛОПАТЫ — МАЕ КЛОПАТЫ

**— Іван Платонавіч, Вы зарэгістрыраваны кандыдатам у народныя дэпутаты БССР. Хацелася б задаць Вам некалькі пытанняў, якія б дапамаглі Вашым выбаршчыкам пазнаёміцца з Вашай праграмай. І першае пытанне гістарычнае — пытанне аб ўладзе. Якімі бачацца Вам кіруючыя структуры нашага грамадства і іх функцыі?**

— Я выступаю за тое, каб уся паўната ўлады была ў свабодна абраных Саветаў, якія працуюць галосна і ў інтарэсах выбаршчыкаў, клапоцяцца аб патрэбах людзей. Думаю, што мясцовыя Саветы павінны забяспечвацца для сваёй плённай работы праз прыняцце Закона аб прыярытэтным адлічэнні ў іх бюджэт падатка з усіх прадпрыемстваў, кааператываў, індывідуальнай працоўнай дзейнасці асоб, якія жывуць на тэрыторыі гэтых Саветаў. А мясцовыя Саветы павінны выкарыстоўваць гэтыя атрыманыя сродкі на дадатковае жыллёвае будаўніцтва, умацаванне здароўя людзей, на адукацыю і культуру, сацыяльную дапамогу, добраўпарадкаванне гарадоў і сёл.

Да таго ж, лічу неабходным удасканаленне кіравання нашым грамадствам. Я думаю, што зло яго ў мінулым і сёння — гэта недасканаласць структур кіравання і валюнтарысцкі падбор кадраў, які асноўваўся часцей за ўсё не на прафесійных і маральных якасцях, а на прынцыпах радства, зямляцтва, пратэкцыянізму. Таму на кіруючыя пасады дзяржаўных і ведамасных структур павінны выбірацца людзі на аснове альтэрнатывы. Да таго ж, прыспеў час поўнасцю адмяніць наменклатуру і назначэнне кадраў.

І яшчэ адно важнае, на маю думку, палажэнне. Ва ўмовах рэальнага палітычнага плюралізму і шматпартыйнасці, руху да прававой дзяржавы мэтазгодна было б у новай Канстытуцыі БССР вызначыць прававое становішча кіруючай партыі. Гэта тычыцца не толькі КПБ, але і любой іншай партыі, якая будзе прыходзіць да ўлады ў выніку свабодных і дэмакратычных выбараў.

**— Зараз БССР знаходзіцца ў цяжкім стане. Калі ласка, Вашы думкі наконт развіцця рэспублікі, яе палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай перспектывы.**

— БССР мне бачыцца ў складзе абноўленага Саюза, але з рэальным эканамічным, палітычным і культурным суверэнітэтам у адпаведнасці з прынятай дэкларацыяй аб суверэнітэце рэспублікі. Яе грамадзяне павінны мець усе гарантыі дэмакратычных свабод, якія ўключаюць поўную свабоду сумлення і недатыкальнасць асобы. Адным з важных аспектаў дзейнасці лічу работу за гарманізацыю міжнацыянальных адносін. Наша рэспубліка сёння знаходзіцца ў вельмі цяжкім становішчы ў сувязі з Чарнобыльскай катастрофай. Таму я выступаю за абвяшчэнне Беларусі зонай надзвычайнага нацыянальнага і экалагічнага бедства. Тыя меры, якія здзяйсняюцца ў рэспубліцы па ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай аварыі, яны нездавальняючыя. Патрэбна буйнамаштабная дапамога не толькі з боку саюзнага кіраўніцтва, іншых рэспублік, але і аб ´яднанне намаганняў сусветнага супольніцтва, інстытутаў і структур Арганізацыі Аб ´яднаных Нацый. Толькі ў гэтым выпадку з ´явіцца магчымасць хуткага адсялення людзей з тых мясцовасцей, якія аказаліся забруджанымі.

Так, наша рэспубліка знаходзіцца ў крызісным становішчы. І таму я лічу, што неабходна як мага хутчэй прыступіць да рэалізацыі рэспубліканскай антыкрызіснай праграмы ў эканоміцы на ўмовах аб ´яднання ўсіх саюзных і аўтаномных рэспублік СССР, захавання адзінай эканамічнай прасторы, канвертаванасці рубля, паступовага раздзяржаўлівання, прыватызацыі і розных форм маёмасці, захоўвання дысцыпліны паставак і працы, эканамічных метадаў гаспадарання. Эканамічнае развіццё грамадства павінна апярэджваць палітычныя працэсы ў ім. І сёння, у такі цяжкі час, я думаю, няма месца для канфрантацыі, а патрэбна аб ´яднанне ўсіх партый і грамадска-палітычных рухаў рэспублікі па вываду яе з крызісу.

**— У перыяд пераходу да рыначнай эканомікі людзі аказаліся ў вельмі складаных умовах. Ці прадугледжвае Ваша праграма сацыяльную абарону грамадзян?**

— Адзін з галоўных пунктаў маёй праграмы — гэта клопат аб чалавеку працы ва ўмовах рынку. Я выступаю за поўную сацыяльную абарону ўсіх слаёў насельніцтва рэспублікі, вобласці, горада Гродна ў цяперашніх умовах пераходу да рыначнай эканомікі, і ў першую чаргу дзяцей, навучэнцаў, студэнцкай і працоўнай моладзі, ветэранаў вайны і працы, пенсіянераў, інвалідаў, сем ´яў якія маюць шмат дзяцей, і адзінокіх маці. У сувязі з ростам цэн патрэбна адэкватнае павышэнне зарплаты, стыпендый, пенсій, дапамог . Неабходна ўстанавіць мінімальны пражытачны мінімум у памеры 200-240 рублёў у месяц на чалавека, адмяніць 5% падатак з продажу, падаходны падатак з кампенсацыі і індэксацыі. А ў нашым горадзе лічу неабходным выкананне гарадской жыллёвай праграмы праз дзяржаўнае, кааператыўнае і індывідуальнае будаўніцтва.

**— Іван Платонавіч, Вашы выбаршчыкі — гэта і моладзь. Ці закранаюцца ў Вашай праграме пытанні, якія хвалююць гэтую сацыяльную групу?**

— Я лічу, што праблемы моладзі ў сённяшнім грамадстве — адны з найбольш важных і тэрміновых. Таму выступаю за выпрацоўку канкрэтнай і паслядоўнай маладзёжнай палітыкі на дзяржаўным узроўні, за прыняцце рэспубліканскага «Закона аб моладзі», які б юрыдычна вызначыў яе сацыяльна-эканамічны і палітычны стасус у грамадстве: права на працу, забеспячэнне жыллём і шлях яго набыцця, стварэнне маладзёжных гасразліковых вытворчых, пасрэдніцкіх і іншых аб ´яднанняў, ільготы для маладых сем ´яў, стварэнне ўмоў для адпачынку і заняткаў спортам і г.д. Я таксама за ўмацаванне сям ´і як першаасновы чысціні, маральнасці нашага грамадства. Да таго ж лічу неабходным правядзенне рэформы ў войску, перавод яго на прафесійную аснову, скарачэнне колькаснага саставу і тэрмінаў службы, увядзенне альтэрнатыўнай службы без зброі. І войска не павінна прымаць удзел ва ўсіх унутраных сварках.

**— Вырашэння якіх пытанняў Вам хацелася б дамагчыся, улічваючы, што Вы гісторык, выкладчык гуманітарных дысцыплін?**

— Як гісторык, як чалавек, які сутыкаецца са скарбніцай нашага народа, яго спадчынай, я не магу пакінуць па-за ўвагай пытанні, якія тычацца мінулага, цяперашняга і будучыні Беларусі. Таму я ў сваёй праграме выступаю за адраджэнне і рэстаўрацыю помнікаў гісторыі і культуры, узнаўленне імёнаў загінуўшых і тых, хто прапаў бяз вестак у гады войн XX стагоддзя, у перыяд сталінскіх рэпрэсій, стварэнне ў горадзе Гродна кнігі «Памяць». Сёння наспела пара, калі духоўнаму, маральнаму і культурнаму адраджэнню народа трэба ўсемагчыма спрыяць, бо бяз гэтага ўжо не абысціся. У гэтым плане трэба ў поўным аб ´ёме і ў намечаны тэрмін рэалізаваць «Закон аб мовах у Беларускай ССР», практычна здзяйсняць прынцып нацыянальна-культурнай аўтаноміі для прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей, што пражываюць у БССР, ствараючы нацыянальныя школы, друкаваныя выданні, культурныя і спартыўныя арганізацыі. У дзіцячых садах, школах, вучылішчах, тэхнікумах і ВНУ праводзіць палітыку гуманізацыі і гуманітарызацыі адукацыі.

**— Ці ёсць у Вашай праграме пункты, звязаныя непасрэдна з праблемамі вышэйшай школы, нашага універсітэта?**

— Як і ўсё наша грамадства, установы вышэйшай адукацыі знаходзяца ў незайздросным становішчы. У нашай рэспубліцы, і я буду за гэта выступаць, калі змагу працаваць у Вярхоўным Савеце, неабходна як мага хутчэй прыняць «Закон аб адукацыі», даць вузам поўнае самакіраванне ў рашэнні пытанняў зместу адукацыі і шляхоў яе рэалізацыі. А што тычыцца універсітэта, дык я падтрымліваю задуму будаўніцтва ў Гродне універсітэскага гарадка, двух студэнцкіх інтэрнатаў гасцінічнага тыпу, аб ´яднанай паліклінікі, студэнцкай сталовай, прафілакторыя, стварыць фонд абароны студэнтаў.

**— Жадаем Вам поспехаў на выбарах!**

**— Дзякуй.**

**Інтэрв ´ю правёў С.Лаўнік.**

## ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: ГРАНІ АБНАЎЛЕННЯ

# Камуністы матфака: пазіцыя ў перабудове

Камуністы матэматычнага факультэта 15 мая сабраліся на свой чарговы партыйны сход. На абмеркаванне вынеслі два пытанні: аб партыйным стажы камуніста Марціросава Г. А. і справаздача партбюро аб рабоце.

І хаця сход быў несправаздачны, вынясенне падобных пытанняў слушна: час ад часу абраны партактыў павінен трымаць адказ перад камуністамі за арганізацыю партыйнай работы на факультэце, даводзіць да ведама членаў партыі прымаемыя рашэнні, абмяркоўваць узнікаючыя праблемы, акрэсліваць поле дзейнасці на бліжэйшую перспектыву.

Выступленне сакратара партбюро В. К. Бойка можна назваць нетрадыцыйным — без загадзя падрыхтаванага і ўзгодненага даклада. Гэта было хутчэй разважанне аб тым, што набалела і накіпела на душы.

Пярвічныя партыйныя арганізацыі, на думку Валерыя Канстанцінавіча, знаходзяцца ў складанай сітуацыі. Няма канкрэтных напрамкаў дзейнасці, якія павінны вызначаць цэнтральныя вышэйстаячыя органы. Дакументы носяць дэкларацыйны характар. Рашэнні, пастановы, якія прымаюцца на вышэйшых узроўнях, не выконваюцца і таму мяняюцца адносіны да іх радавых членаў партыі. І сакратары пярвічных партарганізацый не могуць нічога рэкамендаваць у такіх умовах. Але добра тое, што ёсць яшчэ людзі, якія лічаць сябе сапраўднымі камуністамі. На факультэце няма праблем у вырашэнні арганізацыйных пытанняў, тэрмінова і сумленна здаюцца партыйныя ўзносы.

Сёння адна з галоўных задач — рэальна ацэньваць сітуацыю, не брацца за тое, што заведама невыконваема. даць магчымасць камуністам заставацца камуністамі ў сваіх учынках. Многія члены КПСС зараз пановему падыходзяць да вытворчай дзейнасці, надаюць ёй больш увагі, часу, укладаюць больш працалюбства. Ідэалы, якія абвяшчае камунізм, засталіся ў кожнага з членаў партыі, нягледзячы на ўсе складанасці і цяжкасці. І трэба быць прыстойным чалавекам, дастойным грамадзянінам, што і вызначае аблічча камуніста.

— Да тае пары, пакуль не выявіцца месца партыі ў новай сітуацыі,— выказаў думку сакратар партыйнай арганізацыі матэматычнага факультэта,— немэтанакіравана прыцягваць радавых камуністаў на рэалізацыю шэрагу пастаноў, якія прымаюцца ў цяперашні час вышэйшымі партыйнымі органамі. Бывае цяжка разабрацца ў складанасцях палітычнай сітуацыі, таму мы, мяркую, абавязаны арганізаваць палітычную вучобу ўсіх камуністаў. Без тэарэтычнай падкаванасці нельга быць палітычным байцом, а без гэтага не вярнуць аўтарытэт партыі. Дзейнасць пярвічных партарганізацый можа засяродзіцца вакол выканання тых палітычных рашэнняў, без якіх нельга абысціся.

На партыйным сходзе было закранута пытанне аб дэпартызацыі вышэйшай школы.

— Пытанне аб дэпартызацыі — гэта пытанне непрынцыповае,— лічыць Валерый Канстанцінавіч.— Калі забароняць дзейнасць партарганізацыі ва універсітэце, то гэта не значыць, што ўсе члены універсітэцкай арганізацыі перастануць быць камуністамі. Яны знойдуць іншыя шляхі аб ´яднання. Яшчэ ідзе гаворка аб тым, каб выключыць асобныя дысцыпліны ў навучанні. Але ж прынцыпы, якія абвяшчаюцца ў гэтых дысцыплінах, носяць агульнадэмакратычны і агульначалавечы характар. Тое, што патрэбна перабудова некаторых курсаў, грамадскіх дысцыплін — гэта правільна.

Членства ў партыі не замінае быць сумленным чалавекам. Іншая справа,што трэба імкнуцца да таго, каб у партыі засталіся сумленныя людзі. І ў гэтым — адна з галоўных задач пярвічкі.

На сходзе было выказана шмат думак, меркаванняў, прапаноў.— Партыя аказалася ў цяжкім становішчы, таму што не была нададзена належная ўвага эканамічным прынцыпам дзейнасці,— сказаў Валянцін Міхайлавіч Варанцоў.— Эканамічны крызіс падштурхнуў КПСС на край бездані. Няма канкрэтнай пазіцыі ў адносінах да ўласнай маёмасці. Таму цэнтр партыйнай работы павінен быць скіраваны на вырашэнне тых пытанняў, якія маюць практычны выхад, а не на ідэалагічную работу.

Дэкан матэматычнага факультэта Лідзія Уладзіміраўна Кірылюк звярнула ўвагу на такі бок дзейнасці, як работа з моладдзю. «Моладдзю цяжка кіраваць, яна становіцца безідэйнай. Кожны выкладчык мае сваіх курсавікоў, дыпломнікаў, праводзіць заняткі. Тут вялікае поле дзейнасці камуністаў, дзе павінна праводзіцца дабратворная работа».

— Месца партыі ўжо вызначана,— сказаў Ігар Алегавіч Змітровіч.— На Красавіцкім (1991 г.) Пленуме кампартыя перастала быць прэзідэнцкай, і адмовілася браць на сябе віну за памылкі ў народнай гаспадарцы. А праграма дзейнасці — гэта рашэнні XXVIII з ´зда КПСС і XXXI з ´езда КПБ. Працаваць складана, мы звыкліся з тым, што нам ўсё давалі зверху. Трэба павялічваць свае асабістыя акцыі, у тым ліку палітычныя. Растлумачыць пастановы. Ва ўсіх агульныя праблемы, але існуюць розныя пункты погляду на іх. Таму неабходна выявіць у супастаўленні агульнае. Казаць аб павышэнні аўтарытэту партыі можна, калі канкрэтная партарганізацыя абараняе інтарэсы выкладчыкаў і студэнтаў.

Сваімі думкамі аб надзённых задачах партарганізацый падзяліўся сакратар партыйнага камітэта універсітэта Э. С. Ярмусік.— Партыйныя арганізацыі камуністаў аказаліся сёння ў складанай сітуацыі,— пачаў сваё выступленне Эдмунд Станіслававіч.— Але мы не маем маральнага права апускаць рукі, бо мы паставім сябе ў яшчэ больш цяжкія ўмовы. Ад партыі патрабуюць нейкага пакаяння. Не будзем ні перад кім каяцца, бо партарганізацыя не робіць нічога дрэннага, што ішло б насуперак інтарэсам, справе, якой мы сябе прысвяцілі. Сёння як ніколі патрэбна палітычная, працоўная актыўнасць. Нашы ідэйныя праціўнікі па колькасці менш за КПБ, але праяўляюць падчас большую актыўнасць. Яны імкнуцца заняць кіруючае становішча ў прэсе, на тэлебачанні, радыё. Але яны не прынеслі з сабою нічога новага. Прадстаўнікі іншых партый ідуць у людзі, а мы не ідзём. Наш народ — гэта студэнты, выкладчыкі і мы павінны быць сярод іх, жыць інтарэсамі працоўнага калектыву. Вельмі важна не забыцца пра моладзь. Выкладчык прыходзіць на лекцыі. І, нярэдка, на гэтым яго зносіны са студэнтамі канчаюцца. Партарганізацыі трэба вышукваць такія шляхі выхаваўчага ўздзеяння, якія будуць прыняты студэнтамі. Не трэба абыходзіць і інтэрнаты, а ставіць пытанні аб бытавых умовах і дабівацца іх вырашэння. Некаторыя камуністы абыякавыя да партыйнай дысцыпліны, да сваіх абавязкаў. Павінна быць пачуццё адказнасці, усведамленне сваёй карысці. Наогул наша пазіцыя — гэта пазіцыя актыўная. Трэба шукаць і плённа працаваць.

На сходзе камуністы факультэта прынцыпова выказвалі свае погляды, уносілі прапановы. Адным словам, пазіцыя акрэслілася дакладна: не быць на збочыне грамадскага жыцця, знайсці сваё месца ў вырашэнні надзённых спраў.

# ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРАЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

## АБ ´ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА 1991/1992 ГОД

На **завочнае навучанне па спецыяльнасцях:**

**матэматыка**, абітурыенты здаюць уступныя экзамены: профільныя — матэматыка (пісьмова), матэматыка (вусна) і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна);

**біялогія**: профільныя — біялогія (пісьмова), хімія (пісьмова) і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна);

**гісторыя, правазнаўства**: профільныя — гісторыя СССР (пісьмова), беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна);

**беларуская мова і літаратура**: профільныя — беларуская мова (дыктоўка), беларуская мова і літаратура (вусна) і няпрофільны — руская мова і літаратура (вусна);

**руская мова і літаратура**: профільныя — руская мова (дыктоўка), руская мова і літаратура (вусна) і няпрофільны—беларуская мова і літаратура (вусна);

**педагогіка і методыка пачатковага навучання**: профільныя — беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна) і няпрофільны — руская мова (дыктоўка);

**фізічная культура**: профільныя — біялогія (вусна), агульная фізічная падрыхтоўка і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна).

**На дзённае навучанне — па спецыяльнасцях, спецыялізацыях або дадатковых напрамках падрыхтоўкі:**

**фізіка і квантавая электроніка ; фізіка і інфарматыка; фізіка і тэхнічная творчасць**: профільныя — фізіка (пісьмова), матэматыка (пісьмова) і няпрофільныя — беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і латаратура (вусна);

**ражыёфізіка і электроніка; аптычныя прыборы і сістэмы**: профільныя — фізіка (пісьмова), фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова) і няпрофільныя—беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна);

**матэматыка; матэматыка і інфарматыка**: профільныя — матэматыка (пісьмова), матэматыка (вусна) і няпрофільныя — беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна);

**матэматыка (вытворчае аддзяленне), матэматыка і фізіка**: профільныя — матэматыка (пісьмова), фізіка (вусна) і няпрофільныя — беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна);

**біялогія і хімія; біялогія і псіхалогія**: профільныя — біялогія (пісьмова), хімія (пісьмова) і няпрофільныя — беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна);

**біялогія і геаграфія**: профільныя — біялогія (пісьмова), геаграфія (вусна) і няпрофільныя—беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна);

**гісторыя і англійская мова; гісторыя і нямецкая мова; гісторыя і французская мова**: профільныя — гісторыя СССР (пісьмова), замежная мова (у адпаведнасці з выбраным напрамкам падрыхтоўкі) (вусна), беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна);

**правазнаўства**: профільныя — гісторыя СССР (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне) і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна);

**беларуская мова, літаратура і культура; польская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура**: профільныя — беларуская мова (дыктоўка), беларуская мова (вусна), беларуская літаратура (вусна) і няпрофільны — руская мова і літаратура (вусна);

**руская мова і літаратура; польская мова і літаратура і руская мова і літаратура**: профільныя — руская мова (дыктоўка), руская мова (вусна), руская літаратура (вусна) і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна).

Абітурыенты, якія паступаюць на спецыяльнасці, звязаныя з вывучэннем польскай мовы і літаратуры, праходзяць гутарку па польскай мове, якая праводзіцца да пачатку ўступных экзаменаў.

**Педагогіка і методыка пачатковага навучання і музыка**: профільныя — беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), музыка і няпрофільны — руская мова (дыктоўка);

**педагогіка і методыка пачатковага навучання і выяўленчае мастацтва**: профільныя — беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), малюнак і няпрофільны — руская мова (дыктоўка);

**педагогіка і методыка пачатковага навучання і методыка выхаваўчай работы**: профільныя — беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), гісторыя СССР (вусна) і няпрофільны — руская мова (дыктоўка);

**фізічная культура і біялогія**: профільныя — біялогія (пісьмова), агульная фізічная падрыхтоўка і няпрофільныя — беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская літаратура (вусна);

**фізічная культура і методыка выхаваўчай работы; фізічная культура і методыка масавай фізкультурна-аздараўленчай работы, фізічная культура і дашкольнае фізічнае выхаванне**: профільныя — біялогія (вусна), агульная фізічная падрыхтоўка і няпрофільныя — беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская літаратура (вусна).

**На вячэрнюю форму навучання па спецыяльнасці:**

радыёфізіка і электроніка: профільныя — фізіка (пісьмова), матэматыка (вусна) і няпрофільны — беларуская мова і літаратура (вусна).

Калі абітурыент не вывучаў беларускую мову і літаратуру (няма адзнакі ў атэстаце аб сярэдняй адукацыі, таму што нядаўна (з 1989 г. і пазней) прыбыў з бацькамі ў рэспубліку з іншых рэгіёнаў краіны або ў сувязі са звальненнем з Узброеных Сіл СССР, магчымы і іншыя ўважлівыя прычыны), і не можа здаваць указаныя ўступныя экзамены, тады пытанне аб замене гэтага ўступнага экзамену вырашае прыёмная камісія. Апошняе не датычыцца асоб, якія паступаюць на філалагічныя спецыяльнасці.

Калі абітурыент здаваў устыпныя экзамены па беларускай мове і літаратуры ў форме сачынення, то гэта вызваляе яго ад здачы вуснага няпрофільнага экзамену па беларускай мове і літаратуры.

Узнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём, асобы, якія скончылі сярэднія спецыяльныя ўстановы або прафесійныя вучылішчы (на базе няпоўнай сярэдняй школы) з дыпломам з адзнакай, пры паступленні ў залежнасці ад спецыяльнасці здаюць адзін наступны экзамен: фізіка, радыёфізіка і электроніка, аптычныя прыборы і сістэмы — фізіка (пісьмова); матэматыка — матэматыка (пісьмова); біялогія (пісьмова); фізічная культура і біялогія — біялогія (пісьмова); фізічная культура з іншымі напрамкамі — біялогія (вусна); гісторыя, правазнаўства — гісторыя СССР (пісьмова); руская мова і літаратура; польская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура — беларуская мова (дыктоўка); педагогіка і методыка пачатковага навучання — беларуская мова і літаратура (сачыненне).

Асобы, якія закончылі сярэднюю школу з залатым (сярэбраным) медалём і паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці па мэтаваму набору, выпускнікі 1991 года педагагічных вучылішч з дыпломам з адзнакай, што паступаюць на спецыяльнасці, якія адпавядаюць атрыманай прафесіі, або маюць рэкамендацыі педагагічнага Савета вучылішча могуць быць залічаны па выніках творчай гутаркі, якая будзе праводзіцца перад уступнымі экзаменамі. Асобы, якія не залічаныя па выніках творчай гутаркі, здаюць адпаведны ўступны экзамен.

Прыём заяў на завочнае навучанне з 6 па 31 мая, на дзённае навучанне — з 25 чэрвеня па 15 ліпеня.

Уступныя экзамены на завочную форму навучання з 1 па 15 чэрвеня, а на дзённую і вячэрнюю — з 16 ліпеня па 2 жніўня.

Да заявы аб прыёме прыкладаюцца: дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале, 6 фотакартак памерам 3х4, медыцынская даведка па форме № 086-У; а на навучанне без адрыву ад вытворчасці і выпіску з працоўнай кніжкі. Па прыбыцці ва універсітэт абітурыенты прад ´яўляюць пашпарт.

На навучанне без адрыву ад вытворчасці прымаюцца, як правіла, асобы, якія пражываюць у БССР.

Асобы, якія маюць адпаведную абранай педагагічнай спецыяльнасці сярэднюю спецыяльную адукацыю, працуюць па атрыманай спецыяльнасці не менш аднаго года і паступаюць на формы навучання без адрыву ад вытворчасці залічваюцца без уступных экзаменаў па выніках гутаркі.

З 1 па 13 ліпеня для абітурыентаў, якія будуць паступаць на ўсе факультэты, ва універсітэце працуюць падрыхтоўчыя курсы. Кошт навучання — 40 рублёў. Грошы неабходна пералічваць на разліковы рахунак універсітэта № 141703 у ОПУ Жылсацбанка г. Гродна, МФО 406518.

На пераліковай квітанцыі пасля адрасу універсітэта абітурыентам павінна быць пастаўлена адзнака «ПК».

Дакументы накіроўваюцца на адрас: 230 023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, універсітэт, прыёмная камісія. Тэлефон: 44-51-03.

# КАГО ЧАКАЕ ВНУ?

**Прыняты новыя Правілы прыёму ў ВНУ. Што ў іх прынцыпова новага? На пытанні карэспандэнта «Народнай газеты» адказвае начальнік Упраўлення ВНУ і педагагічнай адукацыі і Міністэрства народнай адукацыі БССР, кандыдат педагагічных навук, дацэнт М. М. Плескацэвіч.**

**— Новыя правілы прыёму прадастаўляюць шырокую свабоду дзеянняў непасрэдна навучальным установам. Яны павінны забяспечыць усім грамадзянам роўныя правы на атрыманне вышэйшай адукацыі. Аднак, заўважу, што пры паступленні на безадрыўныя формы навучання перавагу аддаюць жыхарам рэспублікі.**

Яшчэ навіна. Правіламі прыёму прадугледжваецца заключэнне дагавораў паміж ВНУ і прыватнымі асобамі, якія жадаюць атрымаць другую спецыяльнасць. Гэтае «рыначнае» палажэнне, дарэчы, закладзена ў праекце Закона аб адукацыі ў БССР пры стварэнні недзяржаўных (існуючых за кошт кааператываў, грамадскіх арганізацый і саміх грамадзян) навучальных установаў, дзе навучанне платнае. Паўтараем, што сёння платнае навучанне (па асабістаму жаданню) магчыма ў выпадку атрымання другой адукацыі.

У новых правілах прыёму знята абмежаванне па ўзросту (раней на дзённую форму навучання прымаліся асобы ва ўзросце да 35 гадоў). Пры паступленні ў медыцынскія ВНУ адменена патрабаванне аб неабходнасці абітурыенту мець двухгадовы медыцынскі стаж работы. Не патрэбны больш характарыстыкі і рэкамендацыі, дакументы аб адносінах да вайсковага абавязку. Неабходнасць медыцынскай даведкі ў БССР вызначаецца самой ВНУ.

**— Адаб ´ецца, відаць, на правілах прыёму ў ВНУ і абвяшчэнне Дэкларацыяй аб дзяржаўным суверэнітэце БССР права нашага народа мець уласную сістэму адукацыі, заснаваную на нацыянальных традыцыях.**

Сёлета ва ўсіх ВНУ абавязковым уступным з ´яўляецца экзамен па беларускай мове і літаратуры. На здзіўленне, гэтае палажэнне выклікала пярэчанне, на жаль, нават з боку асобных кіраўнікоў ВНУ, адказных сакратароў прыёмных камісій.

**— Вышэйшая школа зведала розныя ўмовы прыёму абітурыентаў — медалістаў. Быў час, калі яны залічваліся ў ВНУ без уступных экзаменаў. І наадварот — калі наяўнасць медаля ўвогуле не прымалася да ўвагі.**

— Неадназначныя адносіны да медалістаў і сёння.

Вопыт паказвае, што ў асноўным студэнты з ліку медалістаў добра падрыхтаваныя. Правіламі сёлетняга прыёму прадугледжана для медалістаў здача аднаго (профільнага) экзамену або ВНУ самастойна вызначае формы прыёму медалістаў.

Пошуку найбольш таленавітых і здольных вучняў максімальна адпавядаюць разнастайныя алімпіяды, пераможцы якіх (на ўзроўні міжнародных, усесаюзных, а таксама рэспубліканскіх, праведзеных у 1990-91 гадах) залічваюцца ў ВНУ без уступных экзаменаў. Пераможцы абласных і мінскага гарадскога тураў (БССР) альбо алімпіяд, праводзімых ВНУ, па рашэнню прыёмнай камісіі могуць быць вызвалены ад уступнага экзамену па адпаведнай дысцыпліне з выстаўленнем адзнакі «пяць».

Чакаецца пашырэнне прыёму на безадрыўныя формы навучання па інжынерных спецыяльнасцях, асабліва тых, хто накіраваны на навучанне ў адпаведнасці з дагаворамі паміж прадпрыемствам, установамі і ВНУ.

**— Востра адчуваецца ў рэспубліцы недахоп педагагічных кадраў: настаўнікаў пачатковых класаў, замежных моў, беларускай мовы і літаратуры, музыкі, фізкультуры, дашкольных работнікаў. Ці ўлічваецца такая сітуацыя новымі правіламі прыёму!**

— Абавязкова. Без здачы ўступных экзаменаў прадугледжана залічэнне рэкамендаваных на педагагічныя спецыяльнасці па мэтаваму прыёму асоб, якія закончылі школу з залатым (сярэбраным) медалём. Органы ўпраўлення народнай адукацыі маюць добры шанц адабраць лепшых і забяспечыць аддаленыя (асабліва сельскія) раёны ў перспектыве падрыхтаванымі кадрамі. Думаецца, што нелагічна, калі выпускнікі школ двойчы здаюць экзамены: першы раз у школе, у чэрвені, а потым праз два тыдні — у другі раз як уступныя ў ВНУ. Верыцца, што вышэйшая школа хутка прыйдзе да такіх форм садружнасці з агульнаадукацыйнай сярэдняй школай, якія дазволяць спалучаць і адбіраць са школы для ВНУ самых падрыхтаваных.

Новыя палажэнні ў прыёме ў ВНУ чакаюць сёлетніх выпускнікоў педвучылішчаў рэспублікі. Пры паступленні на спецыяльнасць, атрыманую ў вучылішчы, без здачы ўступных экзаменаў (як на стацыянар, так і на завочныя аддзяленні) залічваюцца тыя, хто ў 1991 годзе закончыць педвучылішча з дыпломам з адзнакай, а пры паступленні на іншыя спецыяльнасці — пры наяўнасці рэкамендацыі педсавета вучылішча. Тыя, хто сёлета закончыць педвучылішча на «пяць» і «чатыры» і накіраваны працаваць у сельскую мясцовасць, будуць залічвацца без здачы экзаменаў на безадрыўную форму са скарочаным тэрмінам навучання. Гэтая ж катэгорыя выпускнікоў, якія будуць працаваць у горадзе, маюць права здаваць адзін экзамен, устаноўлены прыёмнай камісіяй ВНУ. Пры атрыманні адзнакі «пяць», яны вызваляюцца ад здачы экзаменаў і залічваюцца ў інстытут, а пры атрыманні адзнакі «чатыры» або «тры» — здаюць астатнія экзамены.

**— Нам застаецца пажадаць, каб пералічаныя экзамены шырэй адчынілі дзверы да вышэйшай адукацыі таленавітым, працавітым, адданым.**

— Жадаем поспехаў! Няхай не праміне іх удача!


Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404, тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Аб ´ём газеты — адзін друкаваны аркуш

Газета надрукавана афсетным спосабам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 16.00.
т.2000 Зак. 3416

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА, ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ, ПАРТКАМ, ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

С. М. ЛАЎНІК